Вячаслаў Віктаравіч Даніловіч

Вячаслаў Віктаравіч Даніловіч (21 лістапада 1973, Полацк) — беларускі гісторык, рэктар Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь (з 2020 года). Доктар гістарычных навук (2023), дацэнт (2005).

Біяграфія

Нарадзіўся ў Полацку. Скончыў Наваполацкую школу № 9 (1991), Беларускі дзяржаўны універсітэт ім. М. Танка (1996), настаўнік гісторыі ў наваполацкай школе (1996), у аспірантуры па спецыяльнасці «Айчынная гісторыя» (1996—1999). Абараніў кандыдацкую дысертацыю па тэме «Дзейнасць арганізацыі «Змагання» ў Заходняй Беларусі (1927—1930 гг.)»[3]. Асістэнт, старшы выкладчык, дацэнт кафедры айчыннай і сусветнай гісторыі. Начальнік Упраўлення падрыхтоўкі навукова-педагагічных кадраў вышэйшай кваліфікацыі ва універсітэце. З 2006 года намеснік дырэктара па навуковай рабоце, з 2010 года дырэктар Інстытута гісторыі НАН Беларусі.

21 верасня 2020 прызначаны на пасаду рэктара Акадэміі кіравання пры прэзідэнце Рэспублікі Беларусь[4]. Даючы згоду на прызначэнне рэктара Аляксандр Лукашэнка з намерам абраў *«гуманітарыя»* Даніловіча і паставіў перад ім адмысловую задачу[5]. З 2024 года дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь 8-га склікання.

Навуковая дзейнасць

Намеснік галоўнага рэдактара часопіса «Гістарычна-археалагічныга зборнік», член рэдакцыйнай калегіі часопіса «Весці нацыянальнай акадэміі наук Беларусі. Серыя гуманітарных наук», член рэдакцыйных саветаў часопіса «Гісторыя і грамадазнаўства» і «Беларускага гістарычнага часопіса».

Вячаслаў Віктаравіч Даніловіч



Дата нараджэння	21 лістапада 1973 (50 гадоў)
Месца нараджэння	Полацк, Віцебская вобласць, БССР, СССР
Род дзейнасці	гісторык, выкладчык універсітэта
Навуковая сфера	гісторыя[1]
Месца працы	Інстытут гісторыі НАНБ Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь
Навуковая ступень	кандыдат гістарычных навук
Навуковае званне	дацэнт
Альма-матар	БДПУ (1996)
Член у	Беларуска-германская гістарычная камісія (https://be.wikipedia.org/w/index.php?title=%D0%91%D0%B5%D0%BB%D0%B0%D1%80%D1%83%D1%81%D0%BA%D0%B0-%D0%B3%D0%B5%D1%80%D0%BC%D

Сфера навуковых інтарэсаў: беларускі палітычны і культурны нацыянальны рух у Заходняй Беларусі 1921—1939 гг. Аўтар больш за 100 прац (шмат у чым у суаўтарстве)[6], з іх асноўныя:

- Дзейнасць арганізацыі "Змаганне" у Заходняй Беларусі (1927—1930) / В. В. Даніловіч. — Мінск : Беларуская навука, 2007. — 155 с. — ISBN 978-985-08-0831-8.
- Моладзь у грамадска-палітычным, сацыяльна-эканамічным і культурным будаўніцтве Савецкай Беларусі (1921—1939 гг.) / В. В. Даніловіч. — Мінск : Беларуская навука, 2020. — 729 с. — ISBN 978-985-08-2659-6.

Гістарычныя погляды

Лічыць, што неабходна «выпрацаваць свой, беларускі погляд на гісторыю Вялікага Княства Літоўскага… менавіта ў перыяд існавання ВКЛ склалася беларуская народнасць, менталітэт …»[7].

20 жніўня 2020 года выказаў свой погляд на бела-чырвона-белы сцяг. Ён адзначыў, што сцяг выкарыстоўваўся беларускімі калабарантамі ў гады Вялікай Айчыннай вайны:

> «Варта задумацца, да чаго вядзём з гэтым сцягам. Па сутнасці, калі мы станем на пазіцыі беларускіх нацыянальных калабарацыяністаў, то … яны хацелі стварыць нейкую беларускую дзяржаву, але стварыць пад нямецкім пратэктаратам. Размова нават не ішла, каб стварыць незалежную дзяржаву. Гэта значыць, апрыёры гаворыцца пра тое, што трэба рухацца пад гэтым сцягам да нейкага пратэктарату са знешняга боку»[8]. (руск.)

У лютым 2021 года заявіў, што ўпершыню Беларусь была аб'яўлена менавіта пад гэтым сімвалам, але паўнавартаснай дзяржавай, на яго думку, так і не стала:

> «Сама гісторыя значна дыскрэдытавала гэты сімвал. Склалася так, што стваральнай функцыі, нейкіх станоўчых, знакавых для беларусаў момантаў пад гэтым сцягам не адбывалася. Так, у першай палове 1990-х гэта быў дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь. Але гэта быў вельмі цяжкі перыяд, калі станоўчыя падзеі проста адсутнічалі»[9].

Узнагароды

0%B0%D0%BD%D1%81%D0%BA%D0%B0%D1%8F+%D0%B3%D1%96%D1%81%D1%82%D0%B0%D1%80%D1%8B%D1%87%D0%BD%D0%B0%D1%8F+%D0%BA%D0%B0%D0%BC%D1%96%D1%81%D1%96%D1%8F&action=edit&editintro=Шаблон:Няма_артыкула/editintro&preload=Шаблон:Няма_артыкула/preload&preloadparams%5B%5D=Q105523375&preloadparams%5B%5D=%D0%91%D0%B5%D0%BB%D0%B0%D1%80%D1%83%D1%81%D0%BA%D0%B0-%D0%B3%D0%B5%D1%80%D0%BC%D0%B0%D0%BD%D1%81%D0%BA%D0%B0%D1%8F+%D0%B3%D1%96%D1%81%D1%82%D0%B0%D1%80%D1%8B%D1%87%D0%BD%D0%B0%D1%8F+%D0%BA%D0%B0%D0%BC%D1%96%D1%81%D1%96%D1%8F&preloadparams%5B%5D=Універсальная+картка)[d][2]

Узнагароды

Цытаты ў Вікіцытатніку

Медыяфайлы на Вікісховішчы

Лаўрэат стыпендыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь таленавітым маладым навукоўцам (2009). Атрымаў медаль Францыска Скарыны (2016).

Зноскі

1. Czech National Authority Database Праверана 7 лістапада 2022.
2. https://www.dgo-online.org/site-dgo/assets/files/4396/mitglieder_kommission.pdf (https://www.dgo-online.org/site-dgo/assets/files/4396/mitglieder_kommission.pdf) Праверана 16 лютага 2021.
3. *В. Данилович*. Деятельность организации «Змаганне» в Западной Беларуси (1927—1930 гг.). Автореферат (https://www.google.ru/?gws_rd=ssl#newwindow=1&q=%D0%94%D0%B7%D0%B5%D0%B9%D0%BD%D0%B0%D1%81%D1%86%D1%8C+%D0%B0%D1%80%D0%B3%D0%B0%D0%BD%D1%96%D0%B7%D0%B0%D1%86%D1%96%D1%96%C2%AB%D0%97%D0%BC%D0%B0%D0%B3%D0%B0%D0%BD%D0%BD%D1%8F%C2%BB&nfpr=1). Человек и наука.
4. «Ён заўсёды быў шэрым, флюгерным»: што кажуць пра новага рэктара Акадэміі кіравання Даніловіча (https://nashaniva.by/?c=ar&i=259441) // nashaniva.by 21 верасня 2020
5. Лукашэнка выказаўся аб вышэйшай адукацыі і патрыятызме... (https://nashaniva.by/?c=ar&i=259414) // nashaniva.by 21 верасня 2020
6. Даніловіч Вячаслаў Віктаравіч (http://history.by/danilovich/). Інстытут гісторыі Нацыянальнай Акадэміі навук.
7. Вячаслаў Даніловіч: Патрэбен свой, беларускі погляд на гісторыю ВКЛ (http://www.belta.by/opinions/view/danilovich-neobhodim-svoj-belorusskij-vzgljad-na-istoriju-vkl-4466/). БЕЛТА. Навіны Беларусі.
8. Над символикой так называемых мирных протестов настоятельно рекомендуют сегодня задуматься историки (https://www.tvr.by/news/obshchestvo/nad_simvolikoy_tak_nazyvaemykh_mirnykh_protestov_nastoyatelno_rekomenduyut_segodnya_zadumatsya_istor/) // tvr.by/news 20 жніўня 2020
9. Рэктар Акадэміі кіравання пра нацыянальны сцяг: Стваральнай функцыі пад гэтым сцягам не адбывалася (https://nn.by/?c=ar&i=268647) // nn.by 19 лютага 2021

Спасылкі

Вячаслаў Віктаравіч Даніловіч у Вікіцытатніку

Вячаслаў Віктаравіч Даніловіч (https://commons.wikimedia.org/wiki/Category:Viachaslau_Viktaravich_Danilovich?uselang=be) на Вікісховішчы

- Вячеслав Данилович: С БЧБ-флагом в истории Беларуси связано очень много негатива _ ВІДЭА (https://www.tvr.by/news/obshchestvo/vyacheslav_danilovich_s_bchb_flagom_v_istorii_belarusi_svyazano_ochen_mnogo_negativa/) // tvr.by 28 студзеня 2021
- Данилович: проголосовал за суверенную и независимую Беларусь (https://www.belta.by/society/view/danilovich-progolosoval-za-suverennuju-i-nezavisimuju-belarus-401544-2020/) // belta.by 5 жніўня 2020
- Мы все из единого корня (http://www.rg.ru/2014/03/13/danilovich.html) // «Союз Беларусь—Россия», № 638(10)

Узята з "https://be.wikipedia.org/w/index.php?title=Вячаслаў_Віктаравіч_Даніловіч&oldid=4683984"